**Умовы правядзення**
**VI адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў**
**педагогаў дадатковай адукацыі**
**“Вучымся ў майстроў”**
*(народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць, фальклорная творчасць)*

Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ініцыіруе правядзенне VI адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў педагогаў дадатковай адукацыі “Вучымся ў майстроў” (далей – адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы).

Адкрытыя міжрэгіянальныя майстар-класы праводзяцца ***з 12 па 30 мая 2025 года*** ў межах рэалізацыі рэспубліканскага інавацыйнага праекта Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі “Укараненне мадэлі рэспубліканскага метадычнага кластара ў сістэму суправаджэння грамадзянска-патрыятычнага выхавання ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі” і рэспубліканскага культурна-адукацыйнага праекта “Беларускае народнае мастацтва і дзеці”.

**Мэта правядзення адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў:** развіццё інтэграванай культурна-адукацыйнай прасторы праз стварэнне прафесійнай супольнасці педагагічных работнікаў для вырашэння задач па пераймальні, захаванні і трансляцыі рэгіянальных народных мастацкіх традыцый; вывучэнне і распаўсюджванне актуальных педагагічных практык выхавання і творчага развіцця дзяцей і моладзі сродкамі традыцыйнага мастацтва беларусаў.

**Задачы:**

знаёмства з эфектыўнымі і прадуктыўнымі методыкамі і тэхналогіямі трансляцыі культурных традыцый беларусаў у адукацыйнай і творчай дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах народнай дэкаратыўна-прыкладной і фальклорнай (музычнай, тэатральнай, харэаграфічнай) творчасці;

падтрымка і развіццё творчай ініцыятывы, актыўнасці педагагічных работнікаў і іх прафесійнага майстэрства;

удасканаленне этнакультурных кампетэнцый удзельнікаў адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў;

выяўленне і абагульненне рэгіянальнага інавацыйнага педагагічнага вопыту па этнакультурным выхаванні навучэнцаў.

**Удзельнікі майстар-класаў:** педагогі дадатковай адукацыі ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і агульнай сярэдняй адукацыі, навучэнцы аб’яднанняў па інтарэсах народнай дэкаратыўна-прыкладной і фальклорнай творчасці.

**Фармат правядзення адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў:**

Фармат правядзення адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў вызначаецца рэгіянальнымі аргкамітэтамі сумесна з аўтарамі майстар-класаў.

Для правядзення адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў рэгіянальнымі аргкамітэтамі вызначаецца адна ўстанова адукацыі вобласці

(г. Мінска), якая забяспечвае ўмовы для прадстаўлення педагагічнага вопыту аўтараў майстар-класаў з іншых устаноў рэгіёна (г. Мінска) па розных кірунках народнай творчасці (павінны прадугледжвацца добрыя транспартныя зносіны).

Неабходна арганізаваць відэазапіс майстар-класаў з наступным яго размяшчэннем на афіцыйнай старонцы ўстановы адукацыі ў YouTube.

**Этапы арганізацыі і правядзення майстар-класаў:**

**I.** ***Арганізацыйна-падрыхтоўчы этап: з 16 красавіка 2025 года па 8 мая 2025 года***

1.1. Агульную каардынацыю арганізацыі і правядзення майстар-класаў здзяйсняе рэспубліканскі аргкамітэт, які ствараецца на базе Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

1.2. Для арганізацыі і правядзення майстар-класаў ствараюцца рэгіянальныя аргкамітэты ў складзе прадстаўнікоў абласных, гарадскіх, раённых устаноў дадатковай адукацыі, Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі, цэнтра выхаваўчай і ідэалагічнай работы (МАІРА), якія вызначаюць тэрмін, змест, умовы і фармат правядзення майстар-класаў.

1.3. Для вызначэння актуальнасці і інавацыйнай каштоўнасці прадстаўленага вопыту, тэхналагічнасці правядзення майстар-класаў, ацэнкі іх эфектыўнасці і змястоўнасці фарміруюцца экспертныя групы Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі і рэгіянальных (абласных, гарадскіх, раённых) устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

1.4. Аўтарамі майстар-класаў могуць выступаць педагагічныя работнікі з высокім узроўнем педагагічнага майстэрства, якія маюць адметныя вынікі творчай дзейнасці, валодаюць інавацыйнымі методыкамі і тэхналогіямі трансляцыі рэгіянальных народных традыцый беларусаў у адукацыйнай і творчай дзейнасці аб’яднанняў па інтарэсах.

1.5. Рэгіянальныя аргкамітэты фарміруюць тэматычную праграму адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў і дасылаюць ***да 24 красавіка 2025 года*** ў Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі *заяўку на іх правядзенне (дадатак 1).*

1.6. Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі складае агульны графік правядзення і агульную тэматычную праграму адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў, якія размяшчаюцца на сайце https://method.nchtdm.by/.

1.7. Рэгіянальныя аргкамітэты фарміруюць *зводную заяўку ад вобласці (г. Мінска) на ўдзел педагагічных работнікаў у адкрытых міжрэгіянальных майстар-класах* і дасылаюць ***да 7 мая 2025 года*** ў Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі *(дадатак 2).*

## *II. Асноўны этап: 12 мая 2025 года – 30 мая 2025 года*

*Змест і накірункі правядзення майстар-класаў*

2.1. Майстар-класы праводзяцца ў адпаведнасці з графікам і складзенай тэматычнай праграмай (п. 1.5, п. 1.6) па асобных накірунках народнай творчасці альбо інтэграваныя.

2.2. Тэмы майстар-класаў вызначаюцца з улікам народных мастацкіх традыцый рэгіёна і арганізацыяй адукацыйнага працэсу ва ўстанове адукацыі.

2.3. Змест майстар-класаў па накірунку *народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць* уключае дэманстрацыю тэхналогій розных відаў народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці, дзейнасць па вырабе твораў народнага мастацтва, дэкаратыўна-прыкладной атрыбутыкі і яе выкарыстанне ў абрадах і святах, непасрэдны і каменціраваны паказ лепшых адукацыйна-выхаваўчых практык, прыёмаў работы, рашэння мастацка-творчых практычных, даследчых задач.

Віды народнай дэкаратыўна-прыкладной творчасці: мастацкі роспіс, мастацкі тэкстыль (ткацтва, вышыўка), кераміка, мастацкая апрацоўка саломкі, выцінанка і інш.

2.4. Змест майстар-класаў па накірунку *фальклорная творчасць* уключае дэманстрацыю дзейнасці і методыкі па засваенні музычных, харэаграфічных, інструментальных, песенных, тэатральных мастацкіх традыцый, прэзентацыю мастацкай рэканструкцыі свят і абрадаў з выкарыстаннем абрадавай атрыбутыкі і музычнай дзеі, непасрэдны і каменціраваны паказ лепшых адукацыйна-выхаваўчых практык, прыёмаў работы, рашэння мастацка-творчых практычных, даследчых задач.

Фальклорная творчасць: музычная, харэаграфічная, тэатральная і інш.

2.5. Інтэграваны майстар-клас аб’ядноўвае вышэйназваныя накірункі *(народная дэкаратыўна-прыкладная творчасць, фальклорная творчасць)* і праводзіцца калектывам аўтараў праз рэалізацыю сумеснага творчага (даследчага) праекта, аб’яднанага адзінай ідэяй.

2.6. Для комплекснага прадстаўлення педагагічнага вопыту і майстэрства, стварэння неабходнай этнакультурнай прасторы ў час правядзення майстар-класаў мэтазгодна афармляць выставачныя экспазіцыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці навучэнцаў і педагогаў, прадстаўляць этнаграфічныя экспанаты, аўдыё-, відэа-, фотаматэрыялы з вынікамі даследчай і творчай дзейнасці; метадычныя распрацоўкі ў выглядзе партфоліа, буклетаў, тэматычных брашур, адукацыйна-метадычных комплексаў педагогаў, якія адлюстроўваюць алгарытмы, мадэлі адукацыйнай і творчай дзейнасці.

2.7. Удзельнікі майстар-класаў актыўна ўключаюцца ў прадуктыўную дзейнасць і праяўляюць ініцыятыву ў працэсе работы, абменьваюцца думкамі, абмяркоўваюць шляхі і спосабы дасягнення якасных вынікаў у выхаванні навучэнцаў сродкамі народнай культуры беларусаў па захаванні

і выкарыстанні здабыткаў этнапедагогікі і народнага мастацтва беларусаў у сучаснай педагагічнай практыцы.

2.8. Праводзіцца калектыўнае падвядзенне вынікаў майстар-класаў, накіраванае на выяўленне пазітыўных тэндэнцый, праблемных пытанняў і пазіцый для далейшага прафесійнага самавызначэння, укаранення традыцыйных і інавацыйных педагагічных практык этнакультурнага выхавання навучэнцаў.

***III. Выніковы этап. Рэфлексійны аналіз і абагульненне вопыту правядзення майстар-класаў: з 2 чэрвеня па 16 чэрвеня 2025 года***

*Прэзентацыя, аналіз вынікаў работы майстар-класаў*

3.1. По выніках правядзення адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў рэгіянальныя аргкамітэты дасылаюць **да 12 чэрвеня 2025 года** ў Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі **творчую справаздачу**, якая ўключае:

– агульную аналітычную інфармацыю аб правядзенні майстар-класаў у рэгіёне;
– метадычныя тэкставыя распрацоўкі майстар-класаў у электронным выглядзе, фотаматэрыялы;
– спасылкі на відэазапісы майстар-класаў, якія размяшчаюцца на афіцыйных старонках устаноў адукацыі ў YouTube *(дадатак 3)*.

3.2. З мэтай распаўсюджвання інавацыйнага педагагічнага вопыту ў галіне этнакультурнага выхавання навучэнцаў, абмену інфармацыяй матэрыялы адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў будуць размешчаны на сайце НЦМТДМ.

3.3. Актуальны вопыт педагогаў дадатковай адукацыі – аўтараў майстар-класаў – будзе прадстаўлены ў рэспубліканскім метадычным зборніку.

3.4. Арганізатары адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў маюць права на апрацоўку персанальных дадзеных удзельнікаў і аўтараў майстар-класаў. Удзел у адкрытых міжрэгіянальных майстар-класах азначае аўтаматычную згоду ўдзельнікаў з умовамі правядзення і з правам арганізатараў на апрацоўку персанальных дадзеных.

3.5. Педагагічныя работнікі – аўтары майстар-класаў – атрымліваюць сертыфікаты VI адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў “Вучымся ў майстроў”, рэгіянальныя аргкамітэты, установы адукацыі, якія забяспечвалі ўмовы правядзення – падзяку рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў.

3.6. Інфармацыю аб правядзенні адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў і творчую справаздачу просім дасылаць на электронную пошту: **nchtdm@nchtdm.by** з адзнакай: міжрэгіянальныя майстар-класы, назва рэгіёна.

Каардынатары: аддзел навукова-метадычнага і псіхолага-педагагічнага суправаджэння дадатковай адукацыі, тэл. 8 (017) 379 56 61

Дадатак 1

**ЗАЯЎКА НА ПРАВЯДЗЕННЕ**
VI адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў “Вучымся ў майстроў”

Рэгіён______________________________________________________

| № п/п | Дата, час правядзення майстар-класаў | База правядзення майстар-класаў. Адрас, кантактныя тэлефоны | Фармат правядзення і тэма майстар-класаў Пазначыць: накірунак (ДПТ, фальклорная творчасць, інтэграваны) неабходныя матэрыялы для ўдзелу ў майстар-класах | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога-майстра – аўтара майстар-класа / педагогаў-аўтараў (цалкам, на беларускай мове) | Пасада, аб’яднанне па інтарэсах, кваліфікацыйная катэгорыя, педагагічны стаж аўтара майстар-класа / педагогаў-аўтараў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

Старшыня рэгіянальнага аргкамітэта (прозвішча, імя, імя па бацьку, подпіс)

Дадатак 2

**ЗВОДНАЯ ЗАЯЎКА НА ЎДЗЕЛ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ**
у VI адкрытых міжрэгіянальных майстар-класах “Вучымся ў майстроў”
Рэгіён______________________________________________________________

| № п/п | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога – удзельніка майстар-класа | Пасада, установа адукацыі, тэлефон установы адукацыі | Кантактны тэлефон удзельніка майстар-класа | Дата наведвання, база правядзення майстар-класаў |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Старшыня рэгіянальнага аргкамітэта (прозвішча, імя, імя па бацьку, подпіс)

Дадатак 3

**Спасылкі на відэазапісы па выніках правядзення**
**VI адкрытых міжрэгіянальных майстар-класаў “Вучымся ў майстроў”**

Рэгіён______________________________________________________

| № п/п | Тэма майстар-класа. Пазначыць накірунак майстар-класа: ДПТ, фальклорная творчасць, інтэграваны | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога-майстра – аўтара майстар-класа / педагогаў-аўтараў (цалкам, на беларускай мове) | Установа адукацыі, кантактныя тэлефоны | Спасылкі на відэазапісы майстар-класаў |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Старшыня рэгіянальнага аргкамітэта (прозвішча, імя, імя па бацьку, подпіс)